# ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ ІНСТЫТУТА ПРЫВАТНАГА НАТАРЫЯТА Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

**У. М. Ангельскі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт**

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь у арт. 2 замацавала, што «чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з’яўляюцца вышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы» [1]. У прававой сістэме беларускай дзяржавы асаблівае месца ў абароне правоў і законных інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб, дзяржаўных інтарэсаў належыць натарыяту.

У Беларусі ў 2011 г. аказвала паслугі насельніцтву 815 дзяржаўных натарыусаў і 47 прыватных. Колькасць здзейсненых натарыяльных дзеянняў у 2011 г. склала больш за 1,2 млрд [2, с. 8]. Прыватны натарыят значна саступае дзяржаўнаму натарыяту. З 1999 г. колькасць прыватных натарыусаў змяншаецца. Такая тэндэнцыя тлумачыцца тым, што ў 1997 г. была прыпынена выдача спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) на здзяйсненне прыватнай натарыяльнай дзейнасці на адзін год, а потым да адпаведнага рашэння Прэзідэнта Беларусі [3], якое да цяперашняга моманту так і не прынята; дзеючыя прыватныя натарыусы спыняюць сваю дзейнасць па розных прычынах.

У такой сітуацыі непрыняцце мер па павелічэнні колькасці прыватных натарыусаў прывядзе да знікнення прыватнага натарыята як грамадскага інстытута ў Беларусі. Гэта будзе сведчыць аб тым, што як беларуская дзяржава, так і беларускае грамадства, на дадзеным этапе свайго развіцця не падрыхтаваны да існавання «вольнага» натарыята, які мае месца ў большасці краін Еўропы, ў Расіі і Казахстане.

Узнікненне прыватнага натарыята ў Беларусі было выклікана аб’ектыўнымі прычынамі: пераходам да рыначных адносін і прадпрымальніцтва, ростам маёмаснага абароту, працэсам прыватызацыі. Савет Міністраў Беларусі у 1992 г. прыняў захады па павелічэнні колькасці супрацоўнікаў дзяржаўных натарыяльных кантор [4]. Тым не менш, наведвальнікі дзяржаўных натарыяльных кантор вымушаны былі круглασутачна дзяжурыць і стаяць у бясконцых чэргах. Дзяржаўным натарыусам прыходзілася працаваць па 16–18 гадзін за адносна невялікую заработную плату [5, л. 1–2]. Адным з мерапрыемстваў па выхаду з крызісу ў натарыяльнай сферы стала пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 26 лістапада 1992 г. «Аб арганізацыі ў горадзе Мінску (з 1994 г. у рэспубліцы) прыватнай натарыяльнай практыкі». Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь даручыў Міністэрству юстыцыі забяспечыць здзяйсненне ў краіне эксперымента прыватнай натарыяльнай практыкі. 5 студзеня 1994 г. Міністр юстыцыі зацвердзіў Палажэнне аб выдачы ліцэнзіі на права заняцця прыватнай натарыяльнай дзейнасцю і правядзення эксперымента гэтага віда дзейнасці ў Беларусі. Да ўдзелу ў

эксперыменце былі дапушчаны найбольш вопытныя дзяржаўныя натарыусы, якія атрымалі ліцэнзіі. У 1993 г. працавала 15 прыватных натырыуса, у 1994 г. – 36, у 1995 г. – 61, у 1996 г. – 106, у 1997 г. – 108, у 2003 г. – 67 [6, с. 27].

Прававы статус прыватнага натарыуса фарміраваўся паступова. У 1992 г. было ўстаноўлена, што прыватныя натарыусы валодаюць роўнымі з дзяржаўнымі натарыусамі правамі і абавязкамі і ўчыненыя імі натарыяльныя дзеянні маюць аднолькавую юрыдычную сілу. Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь замацаваў, што прыватная натарыяльная дзейнасць не з'яўляецца прадпрымальніцкай, прыватны натарыус, як і дзяржаўны натарыус, дзейнічае ад імя Рэспублікі Беларусь. Акты заканадаўства прадугледжвалі і прадугледжваюць асаблівасці ажыццяўлення прыватнай натарыяльнай дзейнасці. Гэта гарантыі таго, што прыватны натарыят паспяхова выконвае ўскладзеныя на яго задачы.

Прыватны натарыят па сваей сутнасці мае больш пераваг, чым дзяржаўны натарыят. Узровень сучаснага заканадаўства аб прыватным натарыяце ў Беларусі дазваляе арганізаваць эфектыўнае рэгуляванне прыватнай натарыяльнай дзейнасці, забяспечыць належную прававую ахову правоў юрыдычных і фізічных асоб, дзяржаўных інтарэсаў. Тым не менш на сучасным этапе для развіцця прыватнага натарыята неабходна, каб вышэйшыя службовыя асобы краіны прынялі адпаведнае рашэнне.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – Минск: Амалфея, 2005. – 48 с.
2. Работа органов юстиции в 2011 году // Юстиция Беларуси. – 2012. – № 2. – С. 3–5.
3. О некоторых мерах по совершенствованию адвокатской и нотариальной деятельности в Республике Беларусь (с изм. и доп.): Декрет Президента Республики Беларусь, 3 мая 1997 г., № 12 // Эталон-Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2012.
4. Вопросы деятельности государственных нотариальных контор Республики Беларусь: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 3 марта 1992 г., № 113 // Эталон-Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2012.
5. Национальный архив Республики Беларусь. – Фонд 99. Народный комиссариат юстиции Белорусской ССР (Министерство юстиции Республики Беларусь). – Оп. 11., 1992–2000. – Д. 45. Организация частной нотариальной деятельности. – 112 л.
6. *Емельянова, Т.* Частный нотариат: 10 лет эксперимента / Т. Емельянова // Юстиция Беларуси. – 2003. – № 2. – С. 25–27.